# СЦЯПАН НЕКРАШЭВІЧ — ГРАМАДСКІ ДЗЕЯЧ І АРГАНІЗАТАР БЕЛАРУСКАЙ НАВУКІ

**Прозвішча Некрашэвіч у беларусаў у першую чаргу асацыюецца з асобай вучонага-мовазнаўцы, аднаго з ініцыятараў і заснавальнікаў Інстытута беларускай культуры, на базе якога пазней была створана Акадэмія навук (цяпер Нацыянальная акадэмія навук Беларусі) — Сцяпана Міхайлавіча Некрашэвіча.**



Нарадзіўся Некрашэвіч у вёсцы Данілаўцы былога Бабруйскага павета (цяпер Светлагорскі раён Гомельскай вобласці) у сялянскай сям'і (у некаторых крыніцах сцвярджаецца, што вучоны паходзіў са старажытнага шляхецкага роду герба «Любіч»). Пачатковую адукацыю атрымаў у "дарэктара" (хатняга настаўніка). У 1908 годзе скончыў настаўніцкую семінарыю ў літоўскім горадзе Панявежыс. Працаваў выкладчыкам пачатковай школы ў Цельшанскім павеце Ковенскай губерні, затым — у школе «Таварыства цвярозасці» ў Вільні. Пазней скончыў Віленскі настаўніцкі ўніверсітэт.

Падчас Першай сусветнай вайны Сцяпан Некрашэвіч знаходзіўся на Румынскім фронце, усе чатыры гады правёў на перадавой. Пасля дэмабілізацыі жыў у Адэсе, дзе загадваў секцыяй пры губернскім аддзеле народнай асветы. На той час у Адэсе знаходзілася вялікая колькасць дэмабілізаваных салдат-беларусаў і беларускіх бежанцаў. Дзякуючы намаганням Некрашэвіча, у Адэсе ў пачатку 1918 года было адкрыта 30 пачатковых беларускіх школ і беларуская змешаная гімназія ў складзе першых чатырох класаў. У гэты ж час Сцяпан Міхайлавіч паступіў у Адэскі міжнародны інстытут. Правучыўшыся там два гады, ён вярнуўся ў 1920 годзе на радзіму. Тут кваліфікаванаму спецыялісту з выдатнай адукацыяй прапанавалі самыя высокія пасады ў апараце Народнага камісарыята асветы. Спачатку Некрашэвіч працаваў загадчыкам літаратурна-выдавецкага аддзела, затым старшынёй навукова-тэрміналагічнай камісіі, якая займалася распрацоўкай пытанняў беларускамоўнай тэрміналогіі ў розных галінах навукі (мовазнаўства, літаратуразнаўства, матэматыкі, батанікі, геаграфіі, геалогіі і інш.). На працягу аднаго года (1921) камісіяй было распрацавана больш за 7 тысяч тэрмінаў. У гэты перыяд урад маладой Савецкай Беларусі асэнсаваў важнасць для рэспублікі не толькі прамысловасці і сельскай гаспадаркі, але і адукацыі, навукі. У выніку 20 сакавіка 1922 года рашэннем Савета Народных Камісараў БССР на базе навукова-тэрміналагічнай камісіі быў створаны Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт). Першым старшынёй Інбелкульта стаў Сцяпан Некрашэвіч. У 1926—1928 гадах ён з'яўляўся старшынёй слоўнікавай камісіі Інбелкульта. Пазней увайшоў ва ўрадавую камісію па падрыхтоўцы і рэарганізацыі Інбелкульта ў Акадэмію навук, а ў 1928 годзе быў прызначаны віцэ-прэзідэнтам Беларускай акадэміі навук. У 1929 годзе Сцяпан Некрашэвіч заняў пасаду дырэктара акадэмічнага Інстытута мовазнаўства. У 1930 годзе акадэміку Некрашэвічу інкрымінавалі ўдзел у «Саюзе вызвалення Беларусі», за што ён быў прыгавораны да 7 гадоў высылкі на Удмурцію. У 1937 годзе Некрашэвіч быў паўторна арыштаваны і прыгавораны калегіяй Вярхоўнага суда БССР да расстрэлу. Прысуд ажыццёўлены 20 снежня 1937 года. Праз дваццаць гадоў, у 1957 годзе, Сцяпан Некрашэвіч быў рэабілітаваны па першым прыгаворы, а ў 1988-м быў рэабілітаваны канчаткова. У званні акадэміка аднаўлены ў 1978 годзе.

Сцяпан Некрашэвіч унёс вялікі ўклад у развіццё беларускай навукі, у першую чаргу нацыянальнага мовазнаўства. Ён заклаў асновы стварэння дыялекталагічных слоўнікаў, сумесна з Байковым падрыхтаваў «Беларуска-расійскі слоўнік» (1926 год) і «Расійска-беларускі слоўнік» (1928). Некрашэвіч распрацаваў таксама канцэпцыю слоўніка жывой беларускай мовы, прымаў удзел у распрацоўцы канцэпцыі гістарычнага слоўніка і праграмы па зборы дыялекталагічнага матэрыялу. Гэтыя працы адыгралі вялікую ролю ў станаўленні лексічнага складу беларускай мовы. Паказальна, што слоўнікі Некрашэвіча застаюцца актуальнымі і да нашых дзён. Пры стварэнні сучасных лексікаграфічных даведнікаў спецыялісты часта звяртаюцца да гэтых прац.

## Паходжанне прозвішча

Многія старажытныя славянскія імёны, якія затым перайшлі ў прозвішчы, служылі не толькі для ідэнтыфікацыі, але выконвалі і прафілактычную функцыю. Каб абараніць сваіх дзяцей ад усялякіх злых сіл, нашы продкі ў старажытныя часы вельмі часта давалі ім немілагучныя імёны або імёны з адмоўным значэннем. Найбольшую групу ўтвараюць імёны-мянушкі з адмоўем «не». Па сведчанні акадэміка Бірылы, імёны з адмоўем «не» ўжываліся на працягу двух-трох стагоддзяў і пасля прыняцця хрысціянства: у XII—XIII стагоддзях. Ды і пазнейшыя пісьмовыя помнікі фіксуюць такога кшталту мянушкі аж да канца XVII стагоддзя. Так, даволі часта ў іменаслоўнай сістэме ўсходніх славян сустракаліся імёны-мянушкі тыпу *Нелюбим*, *Недбала* (ад старабеларускага слова дбати «дбаць, рупіцца, клапаціцца»), *Невер* (ад слова *невер* «чалавек, які не верыць, бязбожнік»), *Нелюд*, *Непуть* (ад рускага слова *непуть* «бесталковы чалавек»), *Неугод*, *Неудача*, *Неклюд*, *Нелеп* (параўн. старабеларускае слова *нелепо* «непрыгожа»). Адной з самых папулярных мянушак гэтай групы была *Некрас*, паходжанне якой звязана са словам старажытнарускай і старабеларускай моў, якое значыла «непрыгожы». Нашчадкаў чалавека з мянушкай *Некрас* сталі называць Некрашэвічамі, што і замацавалася з цягам часу ў аснове прозвішчаў.

## Сучасныя Некрашэвічы

Некрашэвіч адносіцца да ліку папулярных беларускіх прозвішчаў. Яно сустракаецца ў многіх рэгіёнах Беларусі: Бярозаўскі, Івацэвіцкі, Лунінецкі, Ляхавіцкі, Пружанскі, Столінскі раёны Брэсцкай вобласці; Талачынскі, Чашніцкі раёны Віцебскай вобласці; Жлобінскі, Жыткавіцкі, Лельчыцкі, Лоеўскі, Нараўлянскі, Петрыкаўскі, Светлагорскі, Чачэрскі раёны Гомельскай вобласці; Астравецкі раён Гродзенскай

**Дзякуючы намаганням Некрашэвіча ў Адэсе ў пачатку 1918 года было адкрыта 30 пачатковых беларускіх школ і беларуская гімназія.**

вобласці; Бялыніцкі, Глускі, Кіраўскі, Клічаўскі раёны Магілёўскай вобласці; Бярэзінскі, Любанскі, Слуцкі, Смалявіцкі, Старадарожскі, Уздзенскі раён Мінскай вобласці. Даволі часта ў антрапаніміконе беларусаў адзначаюцца і аднакаранёвыя прозвішчы: Некраш, Някраш (Браслаўскі раён Віцебскай вобласці; Карэліцкі раён Гродзенскай вобласці; Мінскі, Нясвіжскі, Старадарожскі, Стаўбцоўскі, Уздзенскі раёны Мінскай вобласці), Някрасаў, Не́красаў (Браслаўскі, Верхнядзвінскі, Лепельскі, Полацкі, Расонскі, Талачынскі, Чашніцкі раёны Віцебскай вобласці; Слаўгарадскі раён Гомельскай вобласці; Ваўкавыскі, Гродзенскі, Зэльвенскі, Іўеўскі, Лідскі раёны Гродзенскай вобласці; Барысаўскі, Бярэзінскі, Маладзечанскі, Мінскі, Мядзельскі, Пухавіцкі, Салігорскі, Смалявіцкі, Старадарожскі раёны Мінскай вобласці). Імя-мянушка *Некрас* адлюстравалася і ў асновах беларускіх геаграфічных назваў: вёска Некрашоўка (Ельскі раён Гомельскай вобласці), вёска Някрасава (Веткаўскі раён Гомельскай вобласці), пасёлак Някрасаў (Гомельскі раён), пасёлак Некрашы, хутар Некрашэвіча (абедзве назвы адносяцца да ліку страчаных, існавалі на тэрыторыі Слуцкага раёна Мінскай вобласці), вёска Некрашы (Баранавіцкі раён Брэсцкай вобласці, ужо не існуе), вёска Некрашунцы (Воранаўскі раён Гродзенскай вобласці), вёска Некрашуны (Астравецкі раён Гродзенскай вобласці), вёска Некрашы (Гродзенскі, Іўеўскі раёны Гродзенскай вобласці), Некрашэвічы (Карэліцкі раён Гродзенскай вобласці), хутар Некрашава (цяпер не існуе, тэрыторыя Карэліцкага раёна), вёска і хутар Някрашава (Сенненскі раён Віцебскай вобласці).




**Ігар КАПЫЛОЎ**